№ 3

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Инв. № 67663
ОБЯЗАТЕЛЬНЫЙ КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

ДАСТОЙНА СУСТРЭЦЬ XVIII З'ЕЗД ВКП(б)

З велізарным задавальненнем і радасцю сустрэлі рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы і інтэлігенцыя нашай краіны паведамленне ЦК ВКП(б) аб прадстаячым XVIII партыйным з'ездзе ВКП(б).

З вялікай увагай працоўныя вывучаюць кожны радок апублікаваных тэзісаў даклада тав. Молатава аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР і тэзісы па дакладу тав. Жданава аб змяненнях у статуце ВКП(б), адобраныя ў асноўным Палітбюро ЦК ВКП(б).

На фабрыках, заводах, прадпрыемствах, у соўгасах, калгасах і ўстановах, дзе абмяркоўваюцца гістарычныя дакументы з'езда, рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па датэрміноваму выкананню і перавыкананню планаў. Яны абавязваюцца з яшчэ большым энтузіязмам і энергіяй працаваць на ўмацаванне нашай радзімы, на блага поўнага тарыжаства комунізма ў нашай краіне.

Паспяховае выкананне плана другой пяцігодкі ўзняла нашу краіну на нябачную вышыню. Звыш 80 процантаў усёй прадукцыі прамысловасці атрымана ў 1937 годзе з нова пабудаваных прадпрыемстваў. Каля 90 проц. трактароў і камбайнаў, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, выпушчаны совецкай прамысловасцю ў другой пяцігодцы.

У рэзультаце паспяховага выканання другой пяцігодкі мы маем гіганцкі рост ва ўсіх галінах нашай соцыялістычнай дзяржавы.

«Соцыялістычная—дзяржаўная і кааператыўна-калгасная—уласнасць на вытворчыя фонды, на прылады вытворчасці і вытворчыя пабудовы к канцу другой пяцігодкі складала 98,7 процанта ўсіх вытворчых фондаў у нашай краіне. Соцыялістычная сістэма вытворчасці стала безраздельна панаваць ва ўсёй народнай гаспадарцы СССР: па валавой прадукцыі прамысловасці яна складала 99,8 проц., па валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі, уключаючы асабістую падсобную гаспадарку калгаснікаў—98,6 процанта, па таваразвароту—100 процантаў».

У тэзісах з усёй нагляднасцю адлюстраваны велізарныя клопаты ўрада і партыі аб людзях, аб чалавеку. Сумы на палепшанне бальнічнай дапамогі, на пашырэнне санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў, на аказанне дапамогі рожаніцам, на арганізацыю адпачынку працоўных павялічваюцца ў трэцяй пяцігодцы з 10,3 мільярда рублёў у 1937 годзе да 16,5 мільярда рублёў, у 1942 годзе. Колькасць месц у яслях і ў дзіцячых садах павялічваецца к канцу трэцяй пяцігодкі да 4,2 мільёна супроць 1,8 мільёна ў 1937 годзе.

У тэзісах даклада тав. Молатава на XVIII з'ездзе ВКП(б) прадугледжан рост сродкаў на культурна-бытавое абслугоўванне працоўных горада і вёскі ў трэцюю пяцігодку больш чым на 1,7 разоў. Павялічваецца ахоп дзяцей у сярэдніх школах, у гарадах і рабочых пасёлках да 12,4 мільёна, супроць 8,6 мільёна ў другой пяцігодцы. А ў сельскіх мясцовасцях з 20,8 да 27,7 мільёна.

Гэтыя лічбы з'яўляюцца бліскучым пацверджаннем, што толькі ў краіне соцыялізма літаральна ўсё падпарадкавана інтарэсам народа. Клопатамі аб росце культурнасці нашага народа, аб добрабыце кожнага чалавека ў паасобку, аб умацаванні магутнасці нашай краіны, аб ператварэнні краіны ў самую перадавую ў свеце прасякнуты ад пачатку да канца ўсе лічбы і факты ў тэзісах даклада таварыша Молатава на XVIII з'ездзе ВКП(б).

Таксама з вялікім інтарэсам партыйныя і беспартыйныя прачытваюць кожнае слова тэзісаў даклада тав. Жданава на XVIII з'ездзе партыі аб змяненнях у статуце ВКП(б).

За годы соцыялістычнага будаўніцтва карэнным чынам змянілася эканамічная і класавая структура нашай краіны. Назаўсёды знішчаны эксплататарскія класы. Сціраюцца межы паміж разумовай і фізічнай працай. Вось чаму ў тэзісах прадугледжана: «У гэтай новай абстаноўцы назрэла неабходнасць змянення прадугледжаных статутам умоў прыёма ў партыю новых членаў. Зараз дзеючы, згодна статута партыі, парадак прыёма ў партыю па чатырох розных катэгорыях, у залежнасці ад соцыяльнага становішча прымаемага ў партыю, яўна не адпавядае змяніўшайся ў рэзультаце перамогі соцыялізма ў СССР класавай структуры совецкага грамадства. Патрэба ва ўстанаўленні розных катэгорый пры прыёме ў партыю і рознага кандыдацкага стажа адпадае. У сувязі з гэтым для ўсіх прымаемых у партыю павінны быць установлены адзіныя ўмовы прыёму і аднолькавы кандыдацкі стаж, незалежна ад іх прыналежнасці да рабочага класа, сялянства, або інтэлігенцыі». У тэзісах прапануецца ўстанавіць адзін год кандыдацкага стажа для ўсіх катэгорый.

У тэзісах таксама ўнесены змены і ў парадак дачы рэкамендацый. Для паступаючага ў партыю неабходна прадставіць тры рэкамендацыі комуністаў з трохгадовым партыйным стажам, ведаючых яго па сумеснай рабоце не менш аднаго году.

Часта пры прыёме ў партыю пярвічныя партыйныя арганізацыі, а таксама райкомы ледзь не рабілі экзамен для паступаючых. Патрабавалі ведання на памяць статута і праграмы ВКП(б). Тэзісамі прапануецца адмяніць статутнае патрабаванне да кандыдатаў, уступаючых у члены партыі, па якому ад кандыдатаў патрабуецца не толькі прызнанне праграмы і статута партыі, але і ўсваенне праграмы. У тэзісах таксама прадугледжаны асабістыя правы членаў партыі.

У тэзісах даклада тав. Жданава прадугледжана адмена ў далейшым масавых чыстак партыі. Гэта дасць магчымасць лепш індывідуальна вывучыць кожнага комуніста ў паасобку. Прапануюцца таксама змены ў арганізацыйнай структуры партыйнага апарата.

Жанчыны Совецкай Беларусі з вялікім натхненнем сустрэлі гэтыя гістарычныя прадз'ездаўскія дакументы. Дзесяткі тысяч чалавек уключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII з'езда ВКП(б) з новымі вытворчымі перамогамі.

Жанчыны Совецкай Беларусі, як і жанчыны ўсяго Совецкага Саюза ў падзяку за сваё цудоўнае жыццё яшчэ цясней згуртуюцца вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), вакол свайго бацькі і друга таварыша Сталіна.

Гераічная і Малунная

23 лютага ўвесь совецкі народ святкуе 21 гадавіну Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота. Гэта—радаснае свята барацьбы і перамог. Перамогі Чырвонай Арміі авеяны сусветнай славай. І ніколі не памеркне гэта слава, ніколі не забыць доблесных спраў бясстрашных чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў, грудзьмі сваімі абараніўшых заваёвы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Велізарнейшыя геніі чалавецтва — таварышы Ленін і Сталін стварылі і выпеставалі Чырвоную Армію. Яны з'яўляюцца яе правадырамі. Комуністычная Партыя большэвікоў—арганізатар яе перамог. У баях з ворагамі рэволюцыі заўсёды на перадавых пазіцыях былі большэвікі. 300 тысяч комуністаў змагаліся на франтах грамадзянскай вайны. Яны былі прыкладам стойкасці і вытрыманасці для ўсёй арміі. 50 тысяч большэвікоў загінула ў баях смерцю адважных. Белагвардзейскія полчышчы Юдзеніча, Калчака, Дзенікіна, белапалякаў і іншых ворагаў адчулі несакрушальную сілу Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота.

Чырвоная Армія — любімае дзецішча ўсяго Совецкага народа. Яе байцоў і камандзіраў, яе доблесных палкаводцаў таварышоў Варашылава, Будзённага, Фрунзе, Чапаева, Шчорса, Пархоменка і другіх горача любяць у нас і дарослыя і старыя і дзеці. Аб іх—легендарных героях, народ складае песні і гераічныя паэмы.

Моцна і неразрыўна сувязь арміі з совецкім народам. У дзень дзесяцігоддзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі таварыш Сталін гаварыў: «Нідзе ў свеце няма такіх любоўных і клапатлівых адносін з боку народа да арміі, як у нас. У нас армію любяць, яе паважаюць, аб ёй клапоцяцца. Чаму? Таму, што ўпершыню ў свеце рабочыя і сяляне стварылі сваю ўласную армію, якая служыць не панам, а былым рабам, зараз вызваленым рабочым і сялянам.

Вось дзе крыніца сілы нашай Чырвонай Арміі».

Народ любіць сваю армію таму, што яна плоць ад плоці народа. Таму што яна дае магчымасць совецкім грамадзянам спакойна працаваць і тварыць, таму што яна ахоўвае, як зяніцу вока недатыкальнасць нашай радзімы ад ворагаў.

З якім задавальненнем совецкі народ сустрэў вестку аб тым, што II Сесія Вярхоўнага Совета СССР па бюджэту 1938 года адпусціла на патрэбы абароны 27 мільярдаў рублёў.

21 гадавіну Чырвоная Армія і Чырвоны Флот сустракаюць з велізарнымі поспехамі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Яна за гады сталінскіх пяцігодак абагацілася магутнейшай сучаснай тэхнікай. Наша армія—першакласная армія свету! У гэтым зараз упэўніліся не толькі друзья, але і ворагі Совецкага Саюза. На падзеях каля возера Хасан Чырвоная Армія асабліва ярка паказала сваю сілу, сваю магутнасць. З якім гарачым патрыётызмам, з якой любоўю да сваёй бацькаўшчыны байцы і камандзіры ішлі на бой з японскімі самураямі, несучы ў сваіх сэрцах імя Вялікага Сталіна. У барацьбе з фашысцкімі захопнікамі, кожны баец паказаў сябе героем, таму што наш чырвонаармеец—высока свядомы грамадзянін Совецкага Саюза.

У гэтым годзе гадавіна Чырвонай Арміі асабліва знамянальна. 23 лютага ўсе байцы, камандзіры і палітработнікі па ўказу Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР прымуць баявую рэволюцыйную прысягу, прысягу на вернасць радзіме, на гатоўнасць у любы момант стаць на яе абарону.

Сіла нашай арміі заключаецца яшчэ ў тым, што яна мае моцны рэволюцыйны тыл. Колькі цудоўных прыкладаў патрыятызма можна прывесці з нашай рэспублікі, якая з'яўляецца фарпостам СССР на захадзе. У гэтым нумары мы расказваем аб адной з гарачых патрыётак нашай радзімы—калгасніцы Бадылевіч, якую Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР прэміраваў за затрыманне шпіёнаў. Насельніцтва пагранічных раёнаў з'яўляецца верным памочнікам слаўных пагранічнікаў у ахове совецкіх граніц. Яно зорка сочыць за тым, каб на нашу свяшчэнную зямлю не праходзілі шпіёны, дыверсанты, засылаемыя капіталістычнымі краінамі.

Увесь совецкі народ разам з сваёй арміяй рыхтуецца да абароны мацеры-радзімы. Увесь совецкі народ памятае ўказанні таварыша Сталіна аб тым, што СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, што мы заўсёды павінны быць гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны.

Разам з усім народам да абароны сваёй радзімы рыхтуюцца і многамільённыя масы совецкіх жанчын. Нашы жанчыны ўжо не раз даказалі сваю гатоўнасць абараняць вялікую бацькаўшчыну соцыялізма. Слаўныя баявыя падругі камандзіраў Далёка-Усходняй Арміі разам са сваімі мужамі, не шкадуючы жыцця, знаходзіліся на лініі агня ў раёне возера Хасан. Яны працавалі ў лазарэтах, неслі баявую вахту на даручаных участках, аддавалі сваю кроў раненым байцам. Уся краіна ганарыцца тым, што сярод тысяч далёкаўсходнікаў узнагароджаных баявымі ордэнамі, ёсць і іх жонкі.

Набыццё вайсковых ведаў стала любімай справай совецкіх жанчын. Прыклад герояў Совецкага Саюза—адважных лётчыц Грызадубавай, Осіпенка і Расковай, натхняюць кожную жанчыну на авалоданне вайсковай справай. У аэраклубах Саюза навучаюцца тысячы дзяўчат, сотні тысяч жанчын вывучаюць супроцьхімічную, стралковую, санітарную справу.

Аднак задачы нашы яшчэ велізарныя. Асабліва нам, жанчынам Совецкай Беларусі, неабходна значна лепш авалодваць вайсковымі ведамі. Кожны завод, кожную фабрыку, кожны калгас нам трэба ператварыць у крэпасць абароны.

Няхай жыве і мацнее Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Чырвоны Флот!

Няхай жыве яе слаўны кіраўнік і палкаводзец Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве яе арганізатар і правадыр вялікі Сталін!

На здымку: тт. Сталін і Варашылаў у прэзідыуме Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў
Фота С. Ласкутава (СФ)

К. Е. ВАРАШЫЛАЎ

У чым сіла Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота

Як магло здарыцца, што галодныя, змучаныя імперыялістычнай вайной, рабочыя і сяляне нашай краіны ва ўзброенай барацьбе перамаглі арміі царскіх генералаў і міжнародных інтэрвентаў?

Як магло адбыцца, што маладая Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, кольскасна ўступаўшыя сваім ворагам, слаба ўзброеныя, цярпеўшыя нястачу ў боепрыпасах і самым неабходным, апракінулі, разбілі на-галаву шматлікія, добра забяспечаныя баявой тэхнікай арміі ўнутранай і знешняй контррэволюцыі?

Галоўная прычына бліскучых перамог Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота заключаецца ў тым, таварышы, што рабочы клас і працоўнае сялянства Расіі змагаліся за свае класавыя інтарэсы, за сваю кроўную справу, што яны, рабочыя і сяляне, самкнуліся ў цесны, брацкі саюз у барацьбе за гэтыя свае класавыя інтарэсы, за незалежнасць сваёй Радзімы, за сваю народную ўладу.

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот былі не толькі ваеннай, баявой арганізацыяй. Яны адначасова былі самай сапраўднай арганізацыяй неразрыўнай сувязі рабочых і сялян! Тут у цесным садружастве байцоў і камандзіраў—лепшых сыноў нашага народа—расла і мацнела ў баявых сутычках з ворагамі, ва ўмовах баявога паходнага жыцця, непарушная дружба, брацкі саюз рабочых і сялян.

Таварыш Ленін у адным з сваіх зваротаў да Чырвонай Арміі вясной 1919 г., растлумачваючы чырвонаармейцам мэты інтэрвентаў, гаварыў:

«Чырвоная Армія моцная тым, што свядома і аднадушна ідзе ў бой за сялянскую зямлю, за ўладу рабочых і сялян, за совецкую ўладу.

Чырвоная Армія непераможна, бо яна аб'яднала мільёны працоўных сялян з рабочымі, якія навучыліся цяпер змагацца... смялей і смялей ідуць на ворага, ведаючы, што блізка яго паражэнне». (Ленін, творы, т. XXIV, стар. 197).

Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Морскі Флот моцны тым, што яны не процістаяць народу, не пастаўлены над ім, не адгароджаны ад яго. Яны—самі складаюцца з лепшай часткі народа, служаць яму, абараняюць інтарэсы ўсяго народа, тым самым абараняючы свае ўласныя інтарэсы.

У рады Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота заўсёды ішлі перадавыя, свядомыя прадстаўнікі рабочага класа і сялянства. На ўсіх этапах грамадзянскай вайны, у самыя цяжкія моманты жыцця нашай дзяржавы, ні на міг не парывалася неразрыўная, арганічная сувязь Чырвонай Арміі з сваім народам. Армія і Флот бесперапынна і багата чэрпалі сілы з рабочых і сялянскіх мас, папаўняючы свае радзеўшыя рады. Усё лепшае, што мелася ў народзе, ішло ў Чырвоную Армію, ішло ў бой.

Пастаяннай любоўю і ўвагай акружаў народ сваю армію.

Таварыш Сталін у сваёй прамове, прысвечанай 10-годдзю РСЧА, гаварыў:

> «Нідзе ў свеце няма такіх любоўных і клапатлівых адносін з боку народа да арміі, як у нас... Наша армія ёсць адзіная ў свеце, якая мае спачуванне і падтрыманне з боку рабочых і сялян. У гэтым яе сіла, у гэтым яе моц». (Сталін. Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі).

Узброеныя сілы Совецкага Саюза з'яўляліся своеасаблівым акумулятарам рэволюцыйнай энергіі і энтузіязма мільённых мас працоўных. Тут, у радах арміі і флота, гэта воля, рэволюцыйная энергія і энтузіязм рабочых і сялян, арганізаваныя і накіраваныя большэвіцкай партыяй у русло барацьбы за совецкую ўладу, за шчасце і новае жыццё народа, нязменна давалі пераможныя, бліскучыя рэзультаты.

У гэтым была, ёсць і будзе сіла і магутнасць нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Гэтага пазбаўлены арміі капіталістычных краін, назначэнне якіх заключаецца ў тым, каб абараняць інтарэсы невялікай кучкі эксплаататараў-капіталістаў супроць інтарэсаў мільёнаў працоўных, супроць сваіх уласных інтарэсаў.

Старая царская армія, як і іншыя буржуазныя арміі, была аплотам закабалення і прыгнечання народаў, насяляўшых царскую Расію.

Наша Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, разграміўшы Калчака і Дзенікіна, Юдзеніча, Врангеля і іншых ворагаў працоўных, разбіўшы і выгнаўшы ў тры шыі з межаў нашай краіны замежных інтэрвентаў і іх агентуру—буржуазна-нацыяналістычныя ўрады, вызваляла прыгнечаныя народы і забяспечвала іх палітычную і эканамічную свабоду і незалежнасць. І таму яна была і ёсць блізкай і роднай вызваленым народам Совецкага Саюза.

З першых дзён свайго існавання Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот будаваліся і выхоўваліся ў духу сапраўднага інтэрнацыяналізма. Інакш і не магло быць. Дзецішча большэвіцкай партыі, яны цалкам успрынялі вялікія ідэі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Гэта рабіла і робіць чырвонаармейцаў і чырвонафлотцаў, нашых камандзіраў і начальніцкі састаў свядомымі барацьбітамі за соцыялізм, за справу вызвалення працоўных усяго свету ад капіталістычнага рабства.

Чырвонаармейцу і чырвонафлотцу, усяму асабоваму саставу арміі і флота чужды пачуцці расавай і нацыянальнай непрыязні, чаго не можа сказаць аб сабе ні адна армія капіталістычных дзяржаў. Наадварот, асновай духоўнага і маральнага выхавання салдат любой капіталістычнай арміі з'яўляецца шавінізм, прывіццё салдату нацыянальнай і расавай нянавісці і варожасці да людзей не яго нацыі або расы.

Чырвонаармеец і чырвонафлоцец, як і ўсякі совецкі грамадзянін, паважае працоўных усіх нацый і рас, адносіцца да іх, як да братоў па працы, па класу. Іменна таму нашы байцы, Чырвоная Армія і Чырвоны Флот карысталіся і карыстаюцца ў працоўных усяго свету нязменнай любоўю.

Крыніца сілы Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота заключаецца, нарэшце ў тым, што іх стварыла, сваёй крывёю заўсёды змацоўвала наша партыя, што іх пеставалі, імі кіравалі таварышы Ленін і Сталін.

З прамовы на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага Совета Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў з удзелам грамадскіх арганізацый і вайсковых часцей, прысвечаным 20-годдзю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У шахматным пакоі менскага Дома Чырвонай Арміі. На здымку: байцы і камандзіры за ігрой у шахматы.
Фото Л. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА).

Білі белых і будзем біць

(Расказ удзельніцы грамадзянскай вайны).

Нарадзілася я на Паўночным Каўказе ў казачай станіцы, старой Міхайлаўцы. Бацька мой быў іншагародні (не каранны жыхар станіцы). Працаваў у станіцы ў кулакоў і ў памешчыка Ерэмізіна. У пачатку 1918 года ў нас на Кубані пачала разгарацца ўзброеная класавая барацьба. Станіца наша вялікая. Насельніцтва яе раздзялялася на два лагеры. Багачы казакі, афіцэрства пачалі арганізоўвацца ў белагвардзейскія атрады. Бедната іншагародняя і бяднейшае казацтва сталі на абарону совецкай улады, супроць багачоў.

З першых дзён барацьбы я пачала аказваць актыўнае садзейнічанне Чырвонай Арміі. Выкрыла белагвардзейцаў: Махавіцкага, Сергеева, Захарава і іншых, паказала дзе яны хавалі зброю, фураж, прадукты, амуніцыю. Мне за гэта пагражалі жорсткай расправай, але гэтага я не баялася.

Пры фармаванні ў 1918 годзе 2-га Кубанскага палка добраахвотна ўступіла ў рады Чырвонай Арміі. Разам пайшлі і два маіх браты: старшы Іван, былы ўдзельнік імперыялістычнай вайны і малодшы Кузьма, 15-гадовы хлапчук. Я была байцом і з вінтоўкай у руках білася з белагвардзейцамі. Была і чырвонай сястрой. Увосень 1918 года белыя пры падтрымцы інтэрвенцыі пачалі моцна націскаць на нас. Мы пакінулі Паўночны Каўказ. Вораг быў лепш узброен, але мы былі моцны духам і не пакідалі верыць у перамогу. Вораг прымусіў нас адступіць у Астраханскія пяскі. Гэта пустое месца, амаль без насельніцтва. У гэтых пясках нас адрэзалі ад дарог, ад цэнтра. Не было харчоў, фуражу для коняй. Некалькі сот кіламетраў прышлося прайсці праз пяскі да Астрахані.

Надышла лютая зіма. Цяжка апісаць перажыты жах. Смерць бязлітасна касіла чырвонаармейцаў. У Астраханскіх пясках загінулі абодвы мае браты і баявыя таварышкі Каця Буракова і Вера Наліўкіна. Сама я захварэла тыфам, цярпела холад і голад. Але баявы дух не пакідаў мяне і ўсіх нашых байцоў.

Тав. Новікава з сынам.

Ніколі не забуду адзін эпізод гэтых цяжкіх дзён. Пры пераходзе з аднаго насельнага пункта ў другі ў дарозе я выбілася з сіл. У гэты час па дарозе праязджаў калмык на двухколцы, у якую быў запрэжан вярблюд. Таварышы папрасілі яго падвезці мяне. Даведаўшыся, што я чырвонаармеец, ён ахвотна згадзіўся на гэта. Завёз мяне да сябе ў юрту, сагрэў, накарміў, напаіў. З якой нянавісцю гаварыў аб белых бандытах гэты стары! Ён ганарыўся тым, што яго сын пайшоў добраахвотна ў Чырвоную Армію.

Спыніліся мы ў вялікай вёсцы Басы. Там размясціўся лазарэт, у якім я працавала. Хворыя і параненыя чырвонаармейцы і камандзіры мяне вельмі любілі за адданасць у рабоце і ўвагу да іх. Голад, які цярпелі тады хворыя ў лазарэце, хваляваў мяне і я прыдумала адну махінацыю. У гэтай мясцовасці жыў буйны рыбапрамысловец, у якога былі вялікія харчовыя запасы, схаваныя ад совецкай улады. Каб даведацца, дзе гэтыя харчы, я нанялася да яго служанкай. Аб тым, што служу ў Чырвонай Арміі, вядома ён не ведаў. Кожны дзень я брала харчы ў рыбапрамыслоўца і рыхтавала чырвонаармейцам ежу. Нават частавала хворых віном.

Работа ў рыбапрамыслоўца дала мне магчымасць выкрыць вялікую шпіёнскую работу сына гэтага гаспадара, які служыў афіцэрам у белай арміі і ўначы прыйшоў да бацькі, каб падрыхтаваць наступленне на нашу часць. Я падслухала яго падпольную размову па тэлефону. У гэтую-ж ноч Чырвоная Армія злавіла гэтых бандытаў і замаскіраваную падводную лодку на беразе ракі.

Увесну часці нашы пачалі перафарміроўвацца. Сфармавалася 7 Самарская дывізія. Байцы акрэплі фізічна. Мяне назначылі ў батарэю байцом і чырвонай сястрой. Нашу часць перакінулі пад Чорны Яр.

За час грамадзянскай вайны мне прыходзілася ўдзельнічаць у дзесятках вялікіх баёў. Такі бой адбыўся паміж намі і белымі каля вёскі Папоўка. Некалькіх чырвонаармейцаў нашай батарэі забілі. Я была паранена і кантужана ў галаву.

Чырвоная Армія выхавала мяне і зрабіла большэвіком. У 1921 годзе мяне прынялі ў члены партыі. Я заўсёды праводзіла і праводжу палітыку партыі, заўсёды іду па правільнаму шляху, указанаму нам Леніным і Сталіным.

У дваццаць першую гадавіну Чырвонай Арміі, я, як удзельніца грамадзянскай вайны, хачу сказаць: белых бандытаў мы білі і будзем біць, каб ім не павадна было саваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод.

Паліна Карпаўна Новікава.

Менск.

ПОЙДЗЕМ усе

З маленькім вузялком прыехала дзяўчына Тацяна да брата. Але яна прывезла самае дарагое—гарачае і палкае прывітанне ад бацькоў. Брат працаваў у Прадкоме 5 Арміі. Часць стаяла ў хлебным сібірскім горадзе Кургане. З усходу чорнай саранчой сунуўся Калчак. Юдзеніч блакіраваў Петраград. Дзенікін абстрэльваў Арол.

— Ну, як там, у нас, у Яраслаўлі?—жартаваў брат.

Таня расказвала,—расказвала аб тым, з якім энтузіязмам мужчыны пайшлі ў Чырвоную Армію абараняць рэспубліку. Урэшце яна дадала:

— Толькі, вось, прадуктаў не стае.

— Трэба спачатку ворагаў прагнаць з нашай зямлі, а потым мы прадуктаў дадзім з Сібіры, з Украіны.

Таня паступіла працаваць тэлефаністкай у ваенную часць. Жыла ў брата. Хутка пачаўся польскі фронт. Многія часці перакідваліся на захад. У гэты час маладой дзяўчыне Тане палюбіўся камандзір роты тав. Абрамаў. Светлыя, вясёлыя ночы, радасныя прагулкі па марознаму гораду, ветлівыя ўсмешкі, гарачыя поціскі рук напаўнялі пяшчотнымі пачуццямі сэрца дзяўчыны, і свет здаваўся такім радасным і прыветлівым...

Але вось, аднаго разу тав. Абрамаў сказаў Тане:

— Наша часць выязджае...

— Куды?—занепакоілася Таня.

— А гэта ваенная тайна...

Абрамаў глядзеў у вочы дзяўчыне, усміхаўся. Яна апусціла вочы, маўчала. Потым нясмела сказала:

— І я з вамі паеду. Паеду, усёроўна куды: у агонь, у бой, усёроўна!.. Я хачу быць разам!.. Я не баюся куль, снарадаў...

Апошняга слова яна не дагаварыла. Таварыш Абрамаў схапіў руку дзяўчыны, моцна паціскаў яе, заглядаючы ў вочы дзяўчыне.

***

Ехалі на захад...

Уральскі хрэбет, пакрыты шчаціністай тайгой, застаўся ззаду. Поезд ішоў ціха, часцяком спыняючыся ў стэпу, чакаючы сваёй чаргі рухацца далей. І ціха шумела тайга...

Высадзіліся недзе недалёка ад Віцебска. Тацяна Грыгораўна стала працаваць у часці, дзе быў муж, тэлефаністкай. У вольны час дапамагала мужу, выконвала канцылярскую работу, была за санітара і сястру адначасна...

Вайна кончылася.

Пачалося соцыялістычнае будаўніцтва. Работа па абароне краіны і ўмацаванню Чырвонай Арміі. Тацяна Грыгораўна не пакідала мужа, дапамагаючы яму сваёй работай. На працягу доўгага часу яна была жаночым арганізатарам часці, у якой зараз служыў муж. З сваімі сяброўкамі—жонамі камандзіраў—яна клапацілася аб утульнасці ў казармах. Прадаўжаючы работу ранейшага жэнарганізатара, жонамі камандзіраў вышыта сто салфетак для тумбачак. Шаснаццаць жанчын часці здалі нормы на значок ГСА, працаваў гурток ППХА. За добрую актыўную работу яна ездзіла на нараду баявых падруг Беларускай ваеннай акругі ў горад Смаленск.

***

Сям'я маёра Абрамава зараз складаецца з трох чалавек. 18-гадовы сын вучыцца на другім курсе Менскага Музычнага тэхнікума. Бацька і матка на варце радзімы.

Часта па вечарах яны сустракаюцца за чашкай чая. Прыходзяць друзья і падругі. І тады ў светлым і ўтульным пакоі пачынаецца задушэўная цёплая гутарка. Маці і бацька, часамі, ўспамінаюць баявыя эпізоды з грамадзянскай вайны.

Слухаючы расказы, сын захапляецца адвагай бацькоў, любоўна глядзіць на медаль «Звязды», якая вісіць у бацькі на грудзях, глядзіць у светлыя вочы маці.

— Ну, калі будзе вайна, пойдзем усёй сям'ёй бараніць сваю радзіму ад ворагаў!—гаворыць маці.—Пойдзем.

М. Цэлеш.

У Менскім педінстытуце ім. А. М. Горкага ідзе падрыхтоўка да ваенізаванага жаночага мота-лыжнага паходу па маршруту Менск—Магілёў—Гомель і назад. На здымку: Студэнткі інстытута—матацыкліскі (злева направа) Красоўская А. І., Вяроўкіна В. К., Якуцёнак У. Ф., Мацюкова Л. В. і Шандова О. Н. на трэніровачных занятках. Фота Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

Звычайная совецкая жанчына

— Бадылевіч, да вас можна?

— Заходзьце, таварыш старшыня!—Старшыня калгаса выцёр у сенцах аб палавіцу боты і, зняўшы намокшую шапку, увайшоў у пакой.

— Я да вас з прыемнай навінай!—Бадылевіч, якая гаспадарыла каля печкі, азірнулася і пільна паглядзела ў твар старшыні.

— Званілі з Менска, вас запрашаюць на кастрычніцкія святы ў сталіцу.

Бадылевіч усміхнулася.

— Няўжо мяне адну?

— З нашага калгаса—вас адну. Паедзеце?

— Канешне.

Бадылевіч горача падзякавала. Увесь гэты дзень яна адчувала сябе неяк усхвалявана, а калі ў наступную раніцу за ёй заехалі на пары, каб адвезці на станцыю, яна была ўжо ў лепшым сваім святочным плацці, радасная, расчырванеўшая, вясёлая.

У вагоне былі знаёмыя. Яны пачалі распытваць—чаго едзе ў Менск? Яна скромна адказала: «Урад запрашае на свята» Але ў гэтай скромнасці была гордасць.

Сталіца вельмі гасцепрыемна прыняла калгасніцу. У адзін з святочных вечароў М. Бадылевіч запрасілі ў Вялікі тэатр оперы і балета на ўрачысты сход.

Старшыня гаварыў:

— У нас тут, таварышы, прысутнічаюць скромныя героі Заходняй граніцы,—піонеры, калгасніцы, пуцявыя абходчыкі. Запрашаем гасцей!—і ён пачаў выклікаць прозвішчы, запрашаючы заняць месцы ў прэзідыуме.

І мімаволі перад вачмі Бадылевіч зноў усплыў той незабыўны летні дзень.

З самай раніцы яна пайшла на свой участак. Яшчэ з вечара брыгадзір даў ёй заданне палоць грады. За лясочкам узышло сонца, высахла раса, лёгкі вецер разагнаў воблакі і дзень з рання абяцаў быць гарачым і сухім. Завязала тужэй хустачку, закасала рукавы і ўзялася за звычайную справу.

За работай і думаецца неяк лягчэй. Жыве Бадылевіч у калгасе. Добры, поўнавесны працадзень забяспечан ёй. Сытая, абутая і навокал, куды не зірнеш, усе жывуць у дастатку.

Ведае Бадылевіч і тое, што не мала ў нас ворагаў, якім заможнае калгаснае жыццё, што косць у горле. Яны імкнуцца ў нашу краіну заслаць сваіх агентаў, каб тыя перашкаджалі рабочым і калгаснікам. Але дарэмныя намаганні! Не адзін раз гэтых самых гадаў тут, на прыгранічных калгасных палях, лавілі. Няма ім праходу на нашу зямлю.

Прыгінаючыся да зямлі Бадылевіч і не заўважыла, як да яе з боку падышлі два чалавекі.

— Добры дзень, цёценька!—пачула яна і павярнулася.

— Добры дзень,—адказала калгасніца, разгінаючыся.

— Лёгкай працы вам,—сказаў ніжэйшы.

— Праца для таго, хто працаваць жадае, заўсёды лёгкая будзе. А вы адкуль?

— А мы тутэйшыя. Ходзім, вось, па калгасах, ды пра насенне пытаем. Можа ў каго авёс лішні ёсць ці віка.

— Нейкія дзіўныя ў вас заняткі,—паціскаючы плячыма сказала Бадылевіч і зноў прыгнулася да зямлі.

— Цётачка,—зноў загаварыў той, хто паніжэй ростам.—З вечару ўчора выйшлі, есці вельмі ахвота. Ці не пачаставалі-б чэсных людзей, у нас і грошы ёсць, заплоцім.

Бадылевіч зірнула на сонца:

— А яно і праўда—перакусіць пара,—згадзілася яна.—У мяне дома ў печы боршч варыцца, па талерцы і для вас знойдзецца...

— Ах, цётачка, дзякуй, век не забудзем, вельмі на боршч ахвотнікі вялікія,—сказаў той, што ўвесь час падтрымліваў гутарку і стараўся сваімі жартамі адвесці падазрэнне. Бадылевіч адразу зразумела, якую тонкую гульню вядуць гэтыя людзі і рашыла не палохаць іх пытаннямі. Яна выцерла рукі фартухом і пайшла першай. Спачатку ішлі моўчкі, потым, нібы нянацку, той, хто да гэтага часу нічога не гаварыў, запытаў:

— Скажыце, а да горада адсюль далёка?

— Не, цягніком блізка,—адказала Бадылевіч.

— Капусты паядзім ды і ў горад,—у нас і ў горадзе справа ёсць!

— Заходзьце!—і Бадылевіч, адчыніўшы дзверы, запрасіла «гасцей» зайсці ў дом.—Раздзявайцеся, прысаджвайцеся. Я вам зараз па талерачцы баршча наллю. Адну толькі хвіліначку,—збегаю паглядзець ці прыгналі маю карову з поля.

Двое прышэльцаў не далі сябе доўга ўпрашваць, яны знялі шапкі і сталі разглядаць фатаграфіі на сценках. Занятыя гэтым, яны і не заўважылі, як у пакой увайшла група калгаснікаў.

— Хто тут капусты хоча, калі ласка на капусту!—голасна сказаў старшыня калгаса і ўсе засмяяліся.

Прышэльцы схапіліся за шапкі і кінуліся да акон, але гэта было дарэмна,—каля кожнага акна ў двары стаяў чалавек.

Увечары сам начальнік заставы прыехаў віншаваць Бадылевіч з паспяховым затрыманнем двух буйных шпіёнаў.

Вось, што прамільгнула ў памяці Бадылевіч, калі яна заняла месца ў прэзідыуме ўрачыстага схода сярод членаў беларускага ўрада.

Урад узнагародзіў скромную калгасніцу—гераіню Заходняй граніцы М. Бадылевіч.

Вярнулася Бадылевіч у калгас, прышлі да яе ў дом аднасяльчане і яна доўга дзялілася з імі сваёй вялікай радасцю.

Звычайныя совецкія людзі. Краіна цэніць іх подвігі.

Е. Садоўскі.

Вораг адчуе нашу сілу

Машына хутка імчалася па дарозе паміж балоцістых хмызнякоў і зарасляў. Шофер старанна расказваў аб палескіх непраходных балотах і аб тым, як воляй большэвікоў гэтыя балоты ператварыліся ў вялікія масівы калгасных зямель, на якіх зараз вырасла багацейшая і культурная калектыўная гаспадарка—калгас «БВА».

На нашы больш падрабязныя запытанні аб калгасе, шофер здзіўлена запытаў:

— А вы ў нас яшчэ ні разу не былі? І не чыталі ў газетах пра яго? Наш калгас—гэта сапрaўдная крэпасць, пабудаваная рукамі большэвікоў.—І калі машына спынілася, ён зноў загаварыў:

— Вось і прыехалі! Цяпер любуйцеся нашым рабочым пасёлкам.

Сапраўды прыгожыя вялікія дамы нагадваюць вясёлы рабочы пасёлак. Электрычнае святло разліваецца ў кожнай кватэры. У дамах стаханаўцаў радыё. Тут-жа, у цэнтры, клуб, бібліятэка, чытальня, амбулаторыя, пошта. Крыху наводаль—дзіцячыя яслі, школа, магазін, наогул культурныя ўстановы, прадастаўленыя для калгаснікаў.

Толькі потым, калі свой погляд пераводзіш у бок, на другія вялікія будынкі ферм з буйнай рагатай жывёлай і пародзістымі свінямі, і на стайні з рысістымі коньмі, на амбары, напоўненыя буйным залацістым зярном, пераканаешся, што гэта буйнейшая заможная калгасная гаспадарка.

Калгас БВА вырас на балотах. Звыш 1.000 гектараў асушана і асвоена тарфяных балотных зямель. На іх штогод вырастаюць багацейшыя ўраджаі аўса, пшаніцы, канапель і бульбы.

— Можна сказаць, што мы падрыхтаваліся да веснавой сяўбы,—гаворыць старшыня калгаса тав. Анісімаў.—Насенне ў нас хопіць. Фонды засыпаны ачышчаным сартавым насеннем. Наша хата-лабараторыя правярае зярно на ўсхожасць. Інвентар таксама адрамантаван. Трактары і сёння гатовы выйсці ў поле. Арганізавалі пяць брыгад, 12 звенняў. З брыгадзірамі і звеннявымі праводзяцца заняткі па агратэхвучобе.

Мы падышлі да брыгады, якая апрацоўвала пяньку. Яна раздзелена на звенні. Па канвееру арганізавана ўдарная работа кожнага з іх. Адны абслугоўваюць ільноапрацоўчую машыну, другія падносяць пяньку з сушні, а трэція апрацоўваюць з-пад мялкі. Дзённую норму большасць жанчын перавыконвае.



Дом калгаса імя БВА, Любаньскага раёна. Фота Грына.

На ферме, якая за адзін мінулы год дала калгасу 164 тысячы рублёў прыбытку, працуе 35 чалавек лепшых людзей калгаса. Сярод іх Аксіння Міхайлаўна Дудзік, якая за сваю выдатную работу ўзнагароджана граматай Вярхоўнага Совета БССР. Тут-жа працуюць даяркамі Наташа Рыгалевіч, комсамолка Тоня Чэркас, Каця Кошман. Гэта выдатныя людзі. Яны любяць сваю работу, свой калгас і гатовы ў любую мінуту пайсці ў бой з ворагамі за сваю цудоўную радзіму, за сваё шчаслівае жыццё.

Калі мы параўналіся з новым будынкам школы на двор, у часе перапынку, высыпала вясёлая, бадзёрая дзетвара. Наперад выдзялілася група юнакоў 8 класа. На грудзях у кожнага абаронныя значкі. 65 значкістаў будучых байцоў. Ёсць свае валейбольныя каманды. Калгаснікі таксама вывучаюць вайсковую справу і здаюць нормы на значкі ППХА, ГСА і ГПА. Ёсць гурток гранатамётчыкаў, Варашылаўскіх стралкоў, Варашылаўскіх кавалерыстаў.

Расце заможнасць. З кожным годам растуць і людзі калгаса. Тут можна сустрэць людзей розных прафесій, розных спецыяльнасцей — рахункаводаў, трактарыстаў, аграномаў, настаўнікаў, урачоў, акушорак, выхаваных калгасам. Свае трактарысты з памочнікамі працуюць на ўласных калгасных трактарах. Яны ў любую мінуту, калі гэта будзе патрэбна, зменяць свой трактар на танк і з імем Вялікага Сталіна ў сэрцы пойдуць у рашучы бой на абарону нашай квітнеючай радзімы — бацькаўшчыны ўсіх працоўных.

У сваім пісьме да калгаснікаў сельгасарцелі імя Чапаева Украінскай ССР калгаснікі калгаса БВА пісалі:

«Кожны з нас—гарачы патрыёт сваёй магутнай і вялікай соцыялістычнай бацькаўшчыны, якая забяспечыла працоўным шчаслівае і радаснае жыццё. За сваю квітнеючую радзіму, за сваю партыю Леніна—Сталіна, за свайго любімага правадыра вялікага і роднага Сталіна мы гатовы ў кожную мінуту разам з магутнай Чырвонай Арміяй абрушыць на ворага, які адважыцца ступіць на свяшчэнную совецкую зямлю, усю знішчальную сілу ваеннай тэхнікі». Гэтыя словы ажыццяўляюцца ў творчай рабоце калгаснікаў.

Старавойтава.

Любаньскі раён.

„НАША АРМІЯ ЁСЦЬ АДЗІНАЯ Ў СВЕЦЕ, ЯКАЯ МАЕ С
І СЯЛЯН. У ГЭТЫМ ЯЕ СІЛА, У І

На здымку: К. Е. Варашылаў гутарыць з байцом (Рэпрадукцыя СФ)
Фота Я. Халіпа.

На здымку: Струнны аркестр падраздзялення, дзе палітруком Н. А. Сафонаў, рыхтуецца да выступлення на вечары мастацкай самадзейнасці ў дзень 21 гадавіны РСЧА.
Фота Л. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА).



На здымку: Малодшы камандзір Н-скай часці Б. М. Козуб (злева) і баец І. В. Гладышаў на тактычных занятках (Кіеўская асобая ваенная акруга).
Фота М. Агеева (Фотахроніка ТАСС)

Наша Армія—сіла моцная

Не забыць нам, не забыць
Дні вялікія,
Дні вялікія, дні суровыя,
Калі ворагі цёмнай хмараю
Абступалі нас, ды з усіх бакоў.
Захацелася ім піць нашу кроў—
Кроў рабочую, кроў сялянскую,
Але сілаю, сілай грознаю
Рушыў смела ў бой народ змучаны.
Застагнала шыр, загула зямля,
Засланіў агонь даль блакітную,
Захісталіся лясы цёмныя,
Ускалыхнуліся горы снежныя.
І гарматны гул,
Чорны цяжкі дым
Перапоўнілі шыр сусветную.
Нас павёў у бой слаўны сокал Клім
На варожыя зграі лютыя,
На крывавых псоў, псоў раз'юшаных.
Пад гарматны стогн,
Пад шрапнельны звон,
Цераз полымя буры вогненнай
З песняй гулкаю мы пайшлі за ім.
Лавай смелаю, ўсемагутнаю,
Пяруном-агнём з края у край зямлі
Разграмілі мы ўсіх ворагаў.
Будуць помніць век.
Паны польскія,
Банды Дутава і Дзенікіна
Віхрабурныя шаблі вострыя
Арлоў-воінаў нашай Арміі.
Ад Украіны да Уральскіх гор,
Ад Каспійскіх вод да вод Поўначы
Быў заліт абшар кроўю-полымем.
Не зламаў ніхто сонцазорны край,
Не схіснуў ніхто сілу грозную,
Нібы волат-гром, баявы народ
Разграміў, разбіў банды дзікія.
І красуецца, нібы вечны май,
Наш свабодны край—
Светлы, вольны край.
Дзе раней былі пушчы вечныя,
Дзе не мог ступіць чалавек нагой,
Там калгаснае поле сцелецца,
Расцвіла зямля наша родная
Пад пылаючым сонцам сталінскім.
А як грымне гром
З новай сілаю,
Пойдзем дружна у бой з Варашылавым,
Разаб'ем, змяцем усіх ворагаў,
Наша Армія—гартаваная,
Наша Армія—сіла моцная,
Наша Армія—бронь магутная.

Запісана ў соўгасе „Доктаравічы" Капыльскага раёна.

ПИСЬМО В РО

Климу Ворошилову
Письмо я написал:
«Товарищ Ворошилов,
Народный комиссар,

В Красную Армию
Нынешний год,
В Красную Армию
Брат мой идет.

Товарищ Ворошилов,
Ты, верно, будешь рад,
Когда к тебе на службу
Придет мой старший брат.

На работе первым
Был он кузнецом,
Будет он примерным
В армии бойцом.

Товарищ Ворошилов,
Ему ты доверяй:
Умрет он, а не пустит
Врага в советский край.

...Е СПАЧУВАННЕ І ПАДТРЫМКУ З БОКУ РАБОЧЫХ ...У ГЭТЫМ ЯЕ МОЦ" (І. СТАЛІН).

Конной армии
командарм т. Щаденко—
член Реввоенсовета

За Сталина— всею семьей

Часы полуночную песню играют.
Все спят. За окошком темно.
В отряд пограничный далекого
края
Колхозница пишет письмо.
«Степан! для тебя материнское
слово
Напутствием было не раз,
Сегодня припомни, сыночек, ты
снова
О жизни ушедшей рассказ.
Как белая свора отца погубила,
Как маялась в горе семья,
Как трех сыновей для отчизны
взростила,
Поставила на ноги я.
До светлого счастья дожить
довелося,
Такого не снилось во сне:
Ведь все, что лелеяла в думах,
сбылося—
Сам Сталин узнал обо мне.
Один из вас—знатный комбайнер
колхоза,
Другому наука дана,
Цветут, как весною в саду нашем
розы
У вас на груди ордена.
Нам жизнь освещает высокое имя,
Как солнце над нашей землей.—
За Сталина, дети, мы песню
подымем,
За Сталина—всею семьей!»

Т. Меншикова—жена командира.

На здымку: (справа налева)—адказны сакратар партбюро тав. К. І. Зубаў гутарыць з маладымі нам. палітрукамі тт. Я. Г. Юрэковым і Г. Ш. Багатыровым.

Фота Л. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА).



На тактычных занятках Н-скай часці.
На здымку: Танк у дазоры
(Фотахроніка ТАСС).

Лев Квітко

ВОРОШИЛОВУ

Слышал я: фашисты
Задумали войну.
Хотят они разграбить
Советскую страну.

Товарищ Ворошилов,
Когда начнется бой,
Пускай назначат брата
В отряд передовой.

Мой брат стреляет метко,
Увидишь это сам,
Когда стрелять прикажешь
На фронте по врагам.

Товарищ Ворошилов,
А если на войне
Погибнет брат мой милый,
Пиши скорее мне.

Товарищ Ворошилов,
Я быстро подрасту
И стану вместо брата
С винтовкой на посту».

Перевел С. Маршак.

Шостая акруговая алімпіяда чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці Маскоўскай ваеннай акругі. На здымку: Удзельнікі алімпіяды—жонка палітрука В. Залугоўская і чырвонаармеец В. Мартыненка танцуюць у першай пары.

Фота Э. Евзерыхіна (СФ).

Зінаіда Орджанікідзе

Шлях большэвіка

(Урывак з кнігі)

ПЯРЭДАДЗЕНЬ ВЯЛІКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Мы пасяліліся на кватэры Г. І. Петроўскага, і Серго адразу-ж з галавой акунуўся ў рэвалюцыйную работу. Ён выходзіў з дому на світанні і вяртаўся позна ўначы. Прымацован ён быў да адной з рабочых акраін горада—да Неўскай заставы.

Часта разам з Серго я хадзіла на рабочыя сходы. Памятаю, як аднаго разу Серго не давалі гаварыць. Нейкі меншавік злосна крычаў яму штосьці ў твар. Але Серго прымусіў меншавіка замаўчаць і пачаў прамову.

Такія бурныя сходы Серго праводзіў штодзённа. Большэвікі ў тыя часы бралі трыбуну з боем.

Серго праводзіў сходы і мітынгі на буйных прадпрыемствах і ў казармах. Ён вёў вялікую арганізацыйную работу па падрыхтоўцы соцыялістычнай рэволюцыі.

Па прапанове Леніна Серго быў уведзен у Петраградскі камітэт большэвікоў і ў выканаўчы камітэт Петраградскага совета.

У гэты перыяд, калі ў Расіі панавалі Керэнскі і дзесяць міністраў—капіталістаў, у Піцеры было вельмі туга з прадуктамі. Цэлымі днямі я прастойвала ў чаргах, дастаючы хлеб, масла, яйкі.

Неяк пад вечар я вярталася дамоў з прадуктамі. Серго вышаў мне насустрач.

— У нас госці,—сказаў ён.

— Хто?—запытала я.

Серго ўсміхнуўся і шапнуў мне на вуха:

— Сталін і Джапарыдзе.

Я вельмі многа чула ад Серго аб Сталіне: Серго гаварыў, што Сталін—лепшы вучань Владзіміра Ільіча, адзін са стварыцеляў большэвіцкай партыі.

Яшчэ ў якуцкай ссылцы Серго падрабязна расказваў мне, як пад кіраўніцтвам Сталіна рыхтаваў ён у 1912 годзе Пражскую канферэнцыю, як ездзіў у Волагду, куды царскія апрычнікі выслалі Сталіна.

Серго, усміхаючыся, правёў мяне ў пакой і прадставіў сваім гасцям.

Алёша Джапарыдзе быў відным закаўказскім большэвіком. Ён загінуў у 1918 годзе ад рукі згоднікаў і англійскіх інтэрвентаў у ліку дваццаці шасці гераічных бакінскіх камісараў.



Г. К. Орджанікідзе

Доўга гутарылі ў той вечар Сталін, Джапарыдзе і Серго. Гутарка ішла на грузінскай мове, і я нічога не магла зразумець.

Абстаноўка была вельмі трывожная. У ліпеньскія дні контррэволюцыя паднялася супроць надыходзячай рэволюцыйнай буры. Быў пушчан агіднейшы паклёп на Ільіча. Гэта быў подлы манеўр ворагаў, разлічаны на тое, каб унесці дэзарганізацыю ў рады большэвіцкай партыі. Пачаліся масавыя арышты, разгром большэвіцкіх газет. Буржуазія патрабавала суда над Леніным.

Многія здраднікі падтрымалі голас буржуазіі. Троцкі, Каменеў, Рыкаў, напрыклад, выказваліся за неадкладную яўку Ільіча на суд.

Сталін цвёрда ўстаў на абарону інтарэсаў пралетарскай рэволюцыі. Ён гаварыў:

— Няма гарантыі, што яго не знішчаць.

Серго, як і заўсёды, быў разам са Сталіным. Пад яго кіраўніцтвам ён вёў энергічную барацьбу за ленінскія лозунгі партыі. Ленін на суд буржуазіі не з'явіўся; ён пайшоў у падполле і жыў спачатку ва ўсім вядомым шалашы на станцыі Разліў, а пасля—у Фінляндыі.

Перад большэвіцкай партыяй стаяла пытанне аб скліканні шостага партыйнага з'езда. Кіраваў падрыхтоўкай з'езда Сталін. Серго па даручэнню Сталіна павінен быў паехаць да Владзіміра Ільіча. Справа была настолькі важная і экстраная, што ён не паспеў нават папярэдзіць мяне аб сваёй доўгай адлучцы.

Раніцой Серго сказаў:

— Буду ў пяць. Разам пойдзем абедаць.

Серго пайшоў; прабіла пяць гадзін, потым восем, дзесяць. У чарзе я наслухалася жудасных

расказаў аб арыштах, аб тым, што Ленін нібы паехаў у пламбіраваным вагоне.

«Мабыць арыштавалі», з сумам думала я. Рашыла паехаць на Неўскую заставу. Пакінуўшы дома запіску, што хутка вярнуся, я накіравалася да трамвайнай астаноўкі.

Да Неўскай заставы было шэсць вёрст. Я баялася, што раз'едуся з Серго, і зноў вярнулася дамоў.

Надыйшла ноч. Так і заснула, не дачакаўшыся Серго.

Раніцой яго зноў не было дома. Я баялася выйсці з кватэры, спадзяючыся, што ён вось-вось можа вярнуцца. Але трэба было ісці за прадуктамі.

У чарзе зноў прышлося слухаць бясконцыя размовы аб рэпрэсіях Керэнскага. Вярнуўшыся дамоў, я з найвялікшай радасцю ўбачыла Серго. Ён сядзеў у паліто каля стала. Касцюм яго быў памяты, да штаноў прысталі сухія травінкі.

— Дзе ты быў?—спытала я ў яго.—Я ўжо думала, што ты арыштаваны.

Серго спакойна адказаў:

— Я быў у Леніна.

Больш ён нічога не стаў мне гаварыць. Значна пазней, у 1924 годзе, Серго сам апісаў сваю паездку да Леніна:

«... Сталін запрапанаваў мне паехаць да Леніна, каб, з аднаго боку, інфармаваць Леніна, а з другога—атрымаць ад яго дырэктывы... Мне быў дан адрас аднаго рабочага, які жыў недалёка ад Сестрарэцка (не даязджаючы адну ці дзве станцыі), і пароль. З вялікай асцярожнасцю я ўзяўся за гэта, баючыся, як-бы не падчапіць шпіка і не праваліць месцазнаходжання Владзіміра Ільіча». Серго прыбыў на станцыю ўначы. Крыху пахадзіўшы, ён знайшоў дом, у якім жыў памянёны рабочы. Самога рабочага не аказалася дома, і жонка яго паслала свайго дзевяці-дзесяцігадовага сына праводзіць Серго. Яны пайшлі да возера, селі ў лодку і, пераправіўшыся на другі бераг, пайшлі па хмызняку. Серго рашыў, што Ленін жыве на якой-небудзь дачы. Раптам яны спыніліся каля сенакосу, дзе стаяў невялікі стог сена. Хлопчык пазваў па імені кагосьці. Вышаў нейкі чалавек, які аказаўся бацькам гэтага хлопчыка. Серго прывітаўся з ім, растлумачыў яму, у чым справа. «Думаю, далей павядзе да Леніна,—успамінае Серго.—У гэты момант падыходзіць да мяне чалавек, брыты, без барады і вусоў. Падышоў і прывітаўся. Я адказаў проста, суха. Тады ён хлопае мяне па плячы і гаворыць:

— Што, таварыш Серго, не пазнаеш?

Аказалася, што са мной гаворыць таварыш Ленін. Я з захапленнем паціснуў яму руку. Пайшлі гутаркі. Праз некалькі мінут Ільіч запрапанаваў мне павячэраць з імі. Аказалася, што ў іх саміх нічога няма: кавалачак чорнага хлеба і селядзец. Вось і ўся іх вячэра.

Пасля гэтай «вячэры» гутарку перанеслі ў «апартаменты» Леніна. Імі з'яўляўся стог сена, у які мы і ўлезлі. Свежае сена пахла вельмі прыемна, было цёпла. Доўга я расказваў, што рабілася ў горадзе ў яго адсутнасць, які настрой рабочых, салдат, што робіцца ў нашай арганізацыі, у Петраградскім совеце, у меншавіцкім ЦВК і т. д. Владзімір Ільіч выслухаў мяне і, задаўшы рад пытанняў, сказаў:

— Меншавіцкія советы дыскрэдытавалі сябе. Тыдні два таму назад яны маглі ўзяць уладу без асаблівых цяжкасцей. Цяпер яны не органы ўлады. Улада ў іх адабрана. Уладу можна ўзяць цяпер шляхам узброенага паўстання, яно не прымусіць чакаць сябе доўга. Паўстанне будзе не пазней верасня—кастрычніка.

Усё гэта я слухаў з напружанай увагай. Уражанне было ашаламляючае. Нас толькі што разбілі, а ён прадсказваў праз месяц-два пераможнае паўстанне!».

Владзімір Ільіч падрыхтаваў рад маленькіх артыкулаў, пісьмы да Сталіна і іншых таварышоў. Серго ўзяў іх, развітаўся і пайшоў.

... Шосты з'езд большэвіцкай партыі быў з'ездам падрыхтоўкі кастрычніцкага штурму. Палітычны даклад рабіў Сталін. Садакладчыкам па пытанню яўкі Леніна на суд быў Серго. Ён гаварыў:

— Ім важна выхваціць як мага больш правадыроў з радоў рэволюцыйнай партыі. Мы ні ў якім выпадку не павінны выдаваць таварыша Леніна.

З'езд далучыўся да прапановы Сталіна і Серго. Геніяльная галава пролетарскай рэволюцыі была захавана.

Хутка пасля правядзення выбараў у Петраградскую гарадскую думу, у пачатку верасня 1917 года, Серго быў накіраван у Тыфліс. Я паехала разам з ім.

У Грузіі ў тыя дні большэвікі вялі жорсткую барацьбу з грузінскімі меншавікамі, якія ўзначальвалі контррэволюцыйны нацыяналістычны блок. Серго прыняў у гэтай барацьбе самы жывы ўдзел.

Разам з Серго мы наведалі яго радзіму—сяло Гарэша. Серго расказаў мне аб сваім мінулым.

Сямі год Серго быў адданы ў царкоўна-прыходскую школу. Пасля сканчэння яе ён паступіў у чыгуначнае вучылішча, якое знаходзілася ў Хамуры, але вымушан быў пакінуць яго праз год з прычыны беднага становішча сям'і.

Аднафамілец—народны настаўнік Сімон Орджанікідзе—узяў да сябе здольнага хлопчыка і, такім чынам, Серго ў 1898 годзе скончыў Харагаульскае двухкласнае вучылішча.

Увосень 1900 года Серго разам са сваім дваюрадным братам—Тарасіем—пераехаў у Тыфліс і паступіў вучыцца ў фельчарскае вучылішча пры гарадской Міхайлаўскай больніцы.

Скончыўшы фельчарскую школу ў 1905 годзе, Серго пераехаў у Заходнюю Грузію, дзе пачалася яго непрымірымая барацьба з меншавікамі. Ён працаваў у якасці прапагандыста і агітатара, арганізоўваў мітынгі—дыскусіі з меншавікамі.

Серго заўсёды меў пры сабе брашуру Сталіна, якая называлася «Каротка аб партыйных разнагалоссях». Гэтая брашура была напісана ў пачатку 1905 года.

Дзевятнаццацігадовым юнаком Серго стаў агульнапрызнаным кіраўніком партыйнай арганізацыі Гудаут. Ён быў у тыя часы членам Сухумскага акруговага камітэта партыі.

Серго быў нястомным, палкім агітатарам.

... Першы арышт Серго адбыўся ў 1905 годзе, калі недалёка ад Гудаут, у сяле Бомбары, ён выгружаў транспарт зброі. Серго быў схоплен царскімі жандармамі і пасаджан у сухумскую турму. У сярэдзіне 1907 года Серго быў выпушчан на парукі і прыехаў у Тыфліс. Тут, у рэдакцыі газеты «Дро» («Уперад»), Серго ўпершыню сустрэў свайго настаўніка і друга—Сталіна...

Дзве смерці

А. СЕРАФІМОВІЧ

У Маскоўскі совет, у штаб, прышла шэравокая дзяўчына ў хустачцы.

Неба было кастрычніцкае, грознае, і па халодных, мокрых дахах, паміж труб поўзалі юнкеры і знімалі вінтовачнымі стрэламі неасцярожных на Совецкай плошчы.

Дзяўчына сказала:

— Я ні чым не магу быць карыснай рэволюцыі. Я хацела-б дастаўляць вам у штаб весткі аб юнкерах. Сястрой—я не ўмею, ды сясцёр у вас многа. Ды і біцца таксама—ніколі не трымала зброі. І вось, калі дасцё пропуск, я буду вам прыносіць весткі.

Таварыш з маўзерам за поясам, у замасленай кожанцы, з праваліўшымся ад бяссонных начэй і сухот тварам, неадступна ўглядаючыся ў яе, сказаў:

— Ашукаеце нас — расстраляем.

— Вы разумееце? Адкрыюць там—вас расстраляюць. Ашукаеце нас—расстраляем тут!

— Ведаю.

— Ды вы ўзважылі ўсё?

Яна паправіла хустачку на галаве.

— Вы дайце мне пропуск ва ўсе пасты і дакумент, што я афіцэрская дачка.

Яе запрасілі ў асобны пакой, да дзвярэй прыставілі часавога.

За окнамі на плошчы зноў пасыпаліся стрэлы—наляцеў юнкерскі бранявік, пастраляў, паспешна ўцёк.

— А чорт яе ведае. Даведкі навёў, але што даведкі,—гаварыў з праваліўшымся сухотным тварам таварыш,—канешне, можа падвесці. Але дадзім. Многа яна аб нас там не зможа раскаzаць. А пападзецца — прыстукнем.

Ёй выдалі фальшывыя дакументы, і яна пайшла на Арбат у Александраўскае вучылішча, паказваючы на вуглах пропуск чырвонаармейцам.

На Знаменцы яна чырвоны пропуск схавала. Яе абкружылі юнкеры і адвялі ў вучылішча ў дзяжурную.

— Я хачу папрацаваць сястрой. Мой бацька забіты ў германскую вайну, калі Самсонаў адступаў. А два браты на Доне ў казачых часцях. Я тут з маленькай сястрой.

— Вельмі добра, вельмі. Мы рады. У нашай цяжкай барацьбе за вялікую Расію мы рады шчырай дапамозе ўсякага благароднага патрыёта. А, вы—дачка афіцэра! Калі ласка.

Яе прывялі ў гасціную.

Прынеслі чай.

А дзяжурны афіцэр гаварыў стаяўшаму перад ім юнкеру:

— Вось што, Сцяпанаў, апраніцеся рабочым. Перабярыцеся на Пятроўку. Вось адрас. Даведайцеся падрабязна аб дзяўчыне, якая ў нас сядзіць.

Сцяпанаў пайшоў, апрануў паліто з крывавай дзірачкай на грудзях—толькі што знялі з забітага рабочага. Надзеў яго штаны, падраныя боты, шапку і ў прыцемках накіраваўся на Пятроўку.

Там яму сказаў нейкі рыжы, лахматы грамадзянін, неяк па асабліваму паводзячы вачмі:

— Так, жыве, у другім нумары нейкая. З сястрычкай маленькай. Буржуйка чортава!

— Дзе яна зараз?

— Ды вось з раніцы няма. Арыштавалі, ма'быць, дачка штабс-капітана, гэта ўжо язва. А вам навошта яна?

— Ды тут яе прыслуга была з адной вёскі з намі. Так, пабачыць хацеў. Бывайце!

Уначы, вярнуўшыся з пастоў, юнкеры абкружылі шэравокую дзяўчыну жывейшай увагай. Дасталі пірожнага, цукерак. Адзін стаў іграць на раялі; другі, стаўшы на калена, смяючыся падаў букет.

— Разнясем усю гэту хамскую орду! Мы ім добра насыпалі. А заўтра ўначы ўдарым ад Смаленскага рынку так, толькі пер'е пасыплецца!

Раніцой яе павялі ў лазарэт на перавязкі.

Калі праходзілі міма белай сцяны, у вочы кінулася: каля сцяны ў ружовай рубашцы, з адкінутай галавой ляжаў рабочы—боты ў гразі, падэшвы пра-

„На тактычных занятках."

На здымку: Роза Рабіновіч—вучаніца 4 класа, 5 школы горада Менска. Фотаэцюд Грунтфеста.

таптаныя, над левым вокам цёмная дзірачка.

— Шпіён!—кінуў ючкер, праходзячы і не зірнуўшы.— Злавілі.

Дзяўчына цэлы дзень працавала ў лазарэце мякка і спрытна, і раненыя ўдзячна глядзелі ў яе шэрыя томнаапушчаныя вочы:

— Дзякуй, сястрыца!

На другую ноч пайшла дадому.

— Ды куды-ж вы? Пачакайце! Небяспечна-ж. Цяпер на кожным вуглу вартуюць. Як з нашай зоны выйдзеце, зараз-жа вас зловяць хамы, а то і падстрэляць без гаворкі.

— Я ім дакументы пакажу, я—мірная. Я не магу. Там сястрычка. Бог ведае, што з ёй! Душа баліць.

— Ну, так, маленькая сястра. Гэта, канешне, так. Але я вам дам двух юнкераў, праводзяць.

— Не, не, не...—спалохана працягнула рукі.—Я адна... Я адна... Я нічога не баюся.

Той уніклівa паглядзеў.

— Н-да... Ну, што-ж... Ідзіце.

«Ружовая рубашка і над вокам цёмная дзірачка... галава адкінута...»

Дзяўчына выйшла з варот і адразу пагрузілася ў акіян цемры—ні рысачкі, ні намёка, ні гука.

Яна пайшла наўскасяк ад вучылішча праз Арбацкую плошчу да Арбацкіх варот. З ёю ішоў маленькі круг цемры, у якім яна разлічала сваю фігуру. Больш нічога—яна адна ва ўсім свеце.

... Так ішла ў цемры, і не было страху... І смутна разлічала сваю цёмную фігуру.

... Усё варушылася навокал—смутна, невыразна, губляючыся, зноў узнікаючы. Усё варушылася: і будынкі, і сцены, і дрэвы. Трамвайныя мачты, рэйкі варушыліся, крывава-чырвоныя ў крывава-чырвонай цемры. І цемра мутначырвоная. І хмары, нізка спусціўшыся, палыхалі-крывавыя.

Яна ішла туды, адкуль лілася гэта маўклівае палыханне. Ішла да Нікіцкіх варот.

Дзіўна, чаму яе да гэтага часу ніхто не паклікаў, не спыніў!

У чарнаце варот, пад'ездаў, на вуглах, ведае—затаіліся дазоры, не спускаюць з яе вачэй. Яна ўся на віду, ідзе, аблітая чырвоным палыханнем, ідзе сярод палыхаючага.

Спакойна ідзе, сціскае ў адной

Удзельніца царыцынскіх баёў 1-й Коннай арміі ўрач-ордэнаносец Ш. Г. Хацімская расказвае дзецям рабочых Гомельскага чыгуначнага вузла аб баях пад Царыцынам.
Фота С. Грына.

руцэ пропуск белых, а ў другой—чырвоных. Хто пакліча, таму і пакажа адпаведны пропуск.

Навокал пуста, толькі без стомы жалобна—чырвонае нямое палыханне. На Нікіцкай жудасна бушавала полымя. Раз'юшаныя языкі ўпіваліся ў багрова нізкія хмары, на якіх бушавалі клубы багровага дыму. Велізарны дом наскрозь свяціўся распаленым асляпляльным святлом.

... Да хмар несліся іскры хвастатай чырвонай птушкі, трэск і няспынны раскалены шэпт—шэпт, які пакрываў сабою ўсё навокал.

... Несцярпіма абдавала гарачынёй. Яна пайшла наўскасяк. І як толькі дайшла да цёмнага вугла, высунулася прыземістая фігура і на штыку дрыжэў водбліск.

— Куды? Хто такая!..

Яна спынілася і паглядзела. Забылася, у якой руцэ, які пропуск. Хвіліна разгубленасці цягнулася. Дула ўзнялася на ўзроўні грудзей.

— Што-ж гэта? Хацела працягнуць правую—і нечакана для сябе працягнула сударгава левую далонь і раскрыла.

У ёй ляжаў юнкерскі пропуск.

Ён пакінуў вінтоўку і нязграбна пачаў распраўляць непаслухмянымі пальцамі. Яна задрыжэла дробным, ніколі нязведаным ёй дрыжэннем. З трэскам ззаду вырваўся з вогнішча сноп іскраў, сударгава асвятліў... На бруднай далоні ляжаў юнкерскі пропуск... уверх нагамі...

«Уфф, т-ты... непісьменны».

— На.

Яна сціснула праклятую паперку.

— Куды ідзеш?—уздагонку ёй.

— У Штаб... у Совет.

— Завулкамі ступай, а то цокнуць.

У штабе яе сустрэлі ўважліва: весткі былі вельмі каштоўныя. Усе ветліва загаварылі з ёй, распытвалі. У кожанцы з сухотным тварам ласкава ёй усміхаўся:

— Ну, малайчына дзеўка! Глядзі толькі не сарвіся.

У змярканні, калі страляніна стала сціхаць, яна зноў пайшла на Арбат. У лазарэт усё падвозілі і падвозілі раненых з раёна. Атака юнкераў ад Смаленскага рынку была адбіта; яны панеслі страты.

Цэлую ноч дзяўчына са змучаным, пахудзелым тварам перавязвала, паіла, папраўляла бінты, і раненыя ўдзячна сачылі за яе вачмі. Досвіткам у лазарэт уварваўся юнкер без шапкі, у рабочым касцюме, ускудлачаны, з скрыўленым тварам.

Ён падскочыў да дзяўчыны:

— Вось... гэта... патаскуха... прадала.

Яна адхіснулася, бледная як палатно, потым твар заліла смяротная фарба, і яна закрычала:

— Вы... вы рабочых забіваеце. Яны рвуцца з страшэннай долі... у мяне... я не ўмею зброяй, вось я вас забівала...

Яе вывелі да белай сцяны, і яна паслухмяна лягла з двума кулямі ў сэрцы на тым месцы, дзе ляжаў рабочы ў сітцавай рубашцы.

І покуль не ўвезлі яе, шэрыя апушчаныя вочы няспынна глядзелі ў кастрычніцкае суровае і грознае неба.

Мары збыліся

Абараняць нашу шчаслівую радзіму з'яўляецца адной з адказных і ганаровых задач працоўных нашай краіны. Будучы яшчэ 16-гадовай дзяўчынкай я ўжо цікавілася вывучэннем ваеннай справы, каб быць гатовай у патрэбны час стаць грудзьмі на абарону нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Д. Слесарава

У 1931 годзе я паехала ў горад Віцебск. Паступіла вучыцца ў фабзавуч панчошніц. Тут-жа ўступіла ў комсамол і з гэтага часу пачала актыўна ўдзельнічаць у абароннай рабоце. Пасля сканчэння стралковай школы без адрыва ад вытворчасці Віцебскі гарком комсамола і гарадскі Совет Асоавіяхіма камандыравалі мяне ў школу снайпінга ў горад Менск. Тут яшчэ больш узбагацілася я ведамі ваеннай справы.

Я ніколі не забываю аб тым, што Цэнтральны Камітэт нашай партыі і асабіста таварыш Сталін вучаць нас на дасягнутым не супакойвацца. І я рашыла на выдатна авалодаць лётнай справай. У 1936 годзе паехала вучыцца ва Усесаюзную парашутную школу ў Маскву, якую скончыла і атрымала званне інструктара-парашутыста. Штодзённа ўпарта вывучаю ваенную і лётную справу. Аўладала авіямашынай і хутка атрымала званне пілота.

Самым радасным днём у маім жыцці быў дзень, калі я зрабіла першы прыжок з самалёта. Добра ведаю, што дзесяткі тысяч нашых шчаслівых жанчын, такія як я адданы ўсёй душой нашай вялікай партыі Леніна—Сталіна, нашаму роднаму бацьку, другу і настаўніку таварышу Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё, за бацькаўскія клопаты аб нас, совецкіх жанчынах.

Я інструктар-лётчык буду вучыць новых лётчыкаў, каб яны лёталі лепш за ўсіх, вышэй усіх і далей усіх! Завяраю ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна, што аддам усе свае сілы і веды, а калі патрэбна будзе і жыццё на карысць нашага шчаслівага народа, на карысць нашай соцыялістычнай радзімы.

Дора Канстанцінаўна Слесарава
інструктар-лётчык.
Бабруйск.

Авалодваем ваеннай справай

Вялікі друг і правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін вучыць увесь совецкі народ быць у стане баявой гатоўнасці і заўсёды памятаць аб капіталістычным абкружэнні. Я добра памятаю гэта ўказанне таварыша Сталіна і імкнуся дасканала вывучыць вайсковую справу, каб у любы момант быць гатовай, па першаму закліку партыі і ўрада, стаць на абарону сваёй радзімы.

З першых-жа дзён работы на фабрыцы я пачала займацца ў гуртку проціпаветранай хімічнай абароны. У мінулым годзе была паслана на дзесяцідзённы збор комсастава ў Менск. Гэты збор даў мне шмат карысці. Пасля яго я ўжо сама стала навучаць рабочых ваеннай справе. 24 работніцы з нашага гуртка здалі нормы на значок ППХА. Зараз займаецца ў ім яшчэ 30 работніц.

У радаснае свята—дзень XXI гадавіны роднай Чырвонай Арміі мне хочацца заверыць партыю і ўрад, што мы прыкладзем усе сілы для таго, каб ператварыць нашу фабрыку ў крэпасць абароны.

Марыя Дзімітраўна **Шамко**—
загадчык склада ПХА.
Бабруйск, фабрыка
ім. Дзяржынскага.

У Гомельскім доме юных тэхнікаў вучні 9 класа школы імя Калініна Зяма Азарх, Моця Меркуловіч і Ося Ліцвінава пабудавалі макет дырыжабля „Чкалаў" з трыма маторамі.

На здымку: Экскурсанты—вучні розных школ Гомеля аглядаюць дырыжабль.
Фота Б. Хэніна (Фотахроніка БЕЛТА).

РЫХТУЕМСЯ ДА СЯЎБЫ

Было гэта ў мінулым годзе. Горкаўскі сельсовет, разам з некалькімі дзесяткамі калгаснікаў і калгасніц, выклікаў мяне на нараду для абмеркавання пытання, як лепш падрыхтавацца і правесці веснавую сяўбу.

На нарадзе я вельмі ўважліва выслухала выступаючых стахановак і стаханаўцаў, якія дзяліліся вопытам сваёй работы, іх прапановы, як трэба змагацца за высокі сталінскі ўраджай.

Усю дарогу ад сельсовета да калгаса абдумвала план: як лепш арганізаваць у звяне работу з тым, каб сяўбу правесці выдатна і ўраджай атрымаць добры. Рашыла заявіць свайму звяну, каб узяць участак зямлі і зрабіць яго паказальным. Калі выказала сваё рашэнне перад звяном, некаторыя струсілі і наадрэз адмовіліся ад гэтага. Тады я сама ўзяла адзін гектар зямлі для паказальнага ўчастка пад лён.

Пачала сваю работу з угнаення глебы. Для гэтага хадзіла па хатах калгаснікаў і прасіла жанчын, каб яны збіралі мне попел і курыны памёт. Усіх тых, хто гэта рабіў, заносіла на чырвоную дошку. Засеяла чыстасортным насеннем і калі пачалі паказвацца ўсходы, кожны дзень да пачатку работы хадзіла глядзець іх. Своечасова прапалола і ўраджай вышаў на славу. 19—20 нумарамі здалі мы дзяржаве высокаякаснае валакно.

І гэта толькі першая мая спроба барацьбы за высокі ўраджай. У гэтым годзе мы рыхтуемся з сваім звяном правесці сяўбу з вялікім поспехам.

Мне 55 год, але жывучы ў такую прыгожую сталінскую эпоху я не адчуваю сваёй старасці. Мы з мужам выпрацавалі 1.000 працадзён, атрымалі столькі зярна, бульбы, кармоў, што не ведаем, куды ўсё гэта дзець.

Я жыву, працую і радуюся, як сваім, так і маіх дзяцей, жыццём. Старэйшы сын Васіль—дырэктар школы, Іван канчае чыгуначны тэхнікум. Дачка працуе буфетчыцай. Такая спакойная і забяспечаная старасць магчыма толькі ў нашай краіне.

А. Карнеенка—*звеннявая калгаса імя Сталіна.*

Чэрыкаўскі раён.

ВЯЛІКАЯ СІЛА

Пачынаючы з 1936 года я безупынна працую на адным з адказнейшых участкаў у калгасе—па ільнаводству. Вопыту ў рабоце па вырошчванню высокаякаснага ільну, як у мяне, так і ў другіх калгаснікаў у той час яшчэ не было. Але думкі аб тым, якія лепш ужыць мерапрыемствы, каб атрымаць высокі ўраджай, не давалі мне спакоя.

Я рашыла паказаць, што лён на нашых палях расце добры. Але перш, чым прыступіць да практычнай работы, пачала вывучаць агратэхніку. Потым, абмеркаваўшы пытанне, дагаварылася з кіраўніцтвам калгаса аб адводзе адпаведнай плошчы зямлі для гэтай мэты. Глебу ўгнаілі курыным памётам і попелам, засеялі чыстасортным насеннем. Старанна і клапатліва даглядалі ўсходы. Вынікі атрымаліся бліскучыя. 10 цэнтнераў 32 кілограмы. 800 грамаў даў кожны гектар. 18-м нумарам высокаякаснага ільнавалакна здаў калгас дзяржаве.

З таго часу прайшло два гады з лішнім. Цяпер такі ўраджай і нават большы з'яўляецца звычайнай справай у нашым калгасе. Мы, на працягу двух год, атрымліваем не менш 11—12 цэнтнераў ільнавалакна з кожнага гектара.

Зараз у калгасе ўсе звенні (іх 10) прыступілі да падрыхтоўкі к надыходзячай большэвіцкай веснавой сяўбе. Збіраем попел, курыны памёт, рыхтуемся пачаць угнаенне глебы пад лён. Мы ў гэтым годзе ўзялі на сябе абавязацельства даць з гектара не менш 15—16 цэнтнераў ільнавалакна не ніжэй 20-га нумару. З гэтымі задачамі мы безумоўна справімся, бо ў нас ёсць усе ўмовы, магчымасці і здольнасці.

У калгасе выраслі сапраўдныя майстры высокага ўраджаю ільна, як напрыклад, Раманоўская, Гарбаценка, Рублеўская, Савельева і інш. Яны з года ў год у сваім звяне даюць рэкордны ўраджай.

Ярчэйшым прыкладам росту жанчын на адказнейшых участках работы ў калгасах з'яўляецца такі факт. У 1936 годзе на раённым злёце жанчын, занятых на кіруючых работах у калгасах, было ўсяго 17 чалавек, а ў гэтым годзе прысутнічала ўжо 700 чалавек. Хіба гэта не з'яўляецца пацвярджэннем слоў правадыра народаў таварыша Сталіна, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла.

Ульяна Іванаўна Маханенка—*адказная па ільну, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.*

Чавускі раён.

На здымку: У бібліятэцы-чытальні г. Быхава хатнія гаспадыні (злева направа): Брук Ш. Ц., Токер Х. Л., Марголіна Л. Е. (на другім плане) Хаўкіна Х. Н. і Брылон Ф. С. вывучаюць „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)".

Фота Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА)

ЧЭХАСЛАВАКІЯ ДА І ПАСЛЯ МЮНХЕНСКАГА АГРАБЛЕННЯ

Увосень 1938 года германскі фашызм, у выніку здрадніцкай палітыкі з боку кіруючых колаў Англіі і Францыі, сваімі тыгравымі кіпцюрамі вырваў тлусты кавалак з цела Чэхаславакіі.

Што ўяўляла сабой Чэхаславакія да Мюнхенскай змовы і якой яна засталася сёння, пасля раздзела.

Па плошчы Чэхаславакія складала 140,5 кв. кілометраў з насельніцтвам у 15,2 мільёнаў чалавек. Па свайму эканамічнаму развіццю Чэхаславакія стаяла ўперадзе прыдунайскіх краін. Яна з'яўлялася высокаразвітай прамысловай краінай са значнай удзельнай вагой інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі. З яе прыродных багаццяў найбольшае значэнне меў каменны вугаль. У 1937 годзе было здабыта каля 17 мільёнаў тон каменнага вугалю і 18 мільёнаў тон бурага вугалю. Па здабычы вугалю Чэхаславакія стаяла на трэцім месцы сярод краін капіталістычнай Еўропы. Многа ў Чэхаславакіі і жалезнай руды. Дваццаць адна доменная і 81 мартэнаўская печ у 1937 годзе выплавілі 1675 тысяч тон чыгуна і 2300 тысяч тон сталі. Акрамя вугалю і жалезнай руды Чэхаславакія мела ў вялікім аб'ёме і другія віды выкапальнай сыравіны, як напрыклад, соль, срэбра, медзь, марганец.

Чэхаславакія славілася сваёй машынабудаўнічай прамысловасцю. Яна вырабляла лакаматывы, вагоны, абсталяванне для цукравых і вінакураных заводаў. Восем аўтамабільных заводаў выпускалі штогод каля 40 тысяч аўтамашын. Вялікай вядомасцю карыстаецца канцэрн Шкода ў півапраслаўленым горадзе Пільзэне—гэта цэлы самастойны горад цэхаў і складаў, прарэзаны чыгуначнымі лініямі і электравозамі. Ва ўсім свеце вядома багемскае (ці, як часта гавораць, «бемскае») люстравае шкло, хрусталь і фаянс, якія выраслі на базе высокасортных глін і каоліна.

З харчовай прамысловасці асабліва вялікае месца займае цукровая прамысловасць. У пражскіх банках любілі гаварыць: «Наша валюта—не крона, а цукар».

Па развіццю чыгуначнага транспарта Чэхаславакія знаходзілася на 5 месцы ў Еўропе. А па сельскай гаспадарцы штогод давала экспартныя лішкі ячменю, аўса, а часта і лішкі жыта.

У выніку Мюнхенскага ограблення і наступных захопаў Чэхаславакія лішылася 41596 квадратных кілометраў (30%. тэрыторыі) і 33 процанта насельніцтва.

Да фашысцкай Германіі адыйшла Судзецкая вобласць і другія раёны (каля 30 тысяч квадратных кілометраў з насельніцтвам у 3,5 мільёна чалавек). Чэхаславакія лішылася ў значнай ступені сваёй вугальнай прамысловасці. З 11 каксавальных пячэй у яе засталося пяць. Трэцяя частка металургічнай прамысловасці адабрана ў яе. Яна страціла буйныя аўтамабільныя заводы, заводы сельскагаспадарчых машын, заводы тэкстыльных машын, электратэхнічныя заводы, веласіпедныя.

Чэхаславакія страціла 85 проц. сваёй узорна абсталяванай шкляной прамысловасці.

Пазбавілася Чэхаславакія і многа надзвычайна каштоўных прыродных багаццяў. Ад яе адышлі жалезныя, цынкавыя, свінцовыя руднікі. Моцна пацярпела лёгкая прамысловасць, прадукцыя якой складала асноўны артыкул замежнага гандлю краіны.

Чэхаславакія страціла 4758 кілометраў усёй чыгуначнай сеткі. Асноўныя чыгуначныя магістралі павінны перасякаць патрэбную, галоўным чынам, Германскую тэрыторыю.

Акрамя фашысцкай Германіі і Польшча захапіла Цешынскую Сілезію (800—900 квадратных кілометраў) з насельніцтвам у 227 тыс. чалавек. Да Венгрыі адыйшла ўся паўднёваўсходняя частка Славакіі, а таксама ўся паўднёвая пладародная даліна Карпацкай Украіны.

Гэта далёка не поўны пералік страт Чэхаславакіі. У рэзультаце Мюнхена яна ператварылася ў эканамічна слабую, неўмацаваную, залежную краіну.

Германскі фашызм імкнецца расчысціць сабе шлях далей, уніз па цячэнню Дуная—у Венгрыю, Румынію, на Балканы.

Нафту, у якой Германія адчувае такую вострую патрэбу, яна разлічвае знайсці ў Румыніі, лес, жалезную руду і медзь, неабходныя германскім фашыстам для вядзення «вялікай» вайны, яна зноў спадзяецца атрымаць на Балканах. Венгрыі, маючай многа зярна, мяса і малочных прадуктаў, адведзена па планах берлінскага генеральнага штаба роля харчовай базы Германіі.

Сапраўдная мэта Берліна складаецца ў тым, каб прадоўжыць ажыццяўленне імперыялістычных планаў, якія песціць фашысцкая Германія.

Аднак народныя масы Германіі ні ў якім разе не раздзялялі той казённы энтузіязм, які дэманстравалі гітлераўцы ў дні ўступлення германскіх войск у судзецкія раёны. Ваенная дэманстрацыя 28 верасня ў Берліне, калі па галоўных гарадскіх магістралях на працягу 4 гадзін бесперапынна ішлі вайсковыя часці да Чэхаславацкай граніцы, не дала «выбуха патрыётычных пачуццяў».

Народ маўчаў. Не гледзячы на ўсю запалоханасць і прыдушанасць, насельніцтва не скрывала незадаволенасці, было варожа настроена да фашысцкіх захопаў.

* * *

У захопленай фашысцкай Германіяй Судзецкай вобласці абвешчан паход супроць усяго чэшскага. Забаронена карыстацца чэшскай мовай у грамадскім жыцці, зменены чэшскія помнікі, перайменаваны вуліцы. Арышты, пагромы, забойствы і самазабойствы—вось фінал гаспадарання гітлераўцаў у Судзетах. Фашысты прымушаюць насельніцтва байкатаваць чэшскія і яўрэйскія магазіны, на якіх павінны быць асаблівыя знакі. Судзецкія рабочыя асуджаны на беспрацоўе, голад, жабрацтва. Цэны ўзняліся неймаверна. Аднак, не гледзячы на жорсткі тэрор, антыфашысты арганізуюць дэманстрацыі пратэста супроць палітыкі фашысцкага тэрора і аказваюць супраціўленне гітлераўскаму фашызму.

Народ супроць фашызма, народ супроць Гітлера. Буйныя надпісы з'явіліся на шасэ,—«Няхай жыве рэспубліка!» і другія антыфашысцскія лозунгі.

Такава воля народа, папаўшага пад ярмо фашызма.

Ліберман.

Парады ўрача

ДЗІЦЯЧЫ ТУБЕРКУЛЕЗ І БАРАЦЬБА З ІМ

Туберкулёз—заразная хвароба. Зараза гэта распаусюджваецца найдрабнейшымі істотамі у выглядзе палачак (бацыл) У целе чалавека гэтыя палачкі хутка размнажаюцца, выдзяляюць моцныя яды, усё гэта разносіцца па арганізму і чалавек захворвае.

Каб заразная хвароба не магла перадацца ад хворага здароваму, патрэбна сазнацельнасць саміх хворых і тых, хто іх абкружае.

Якія крыніцы заразы? Найбольш частая крыніца заражэння туберкулёзам, гэта капельная інфекцыя. З пырскамі слюны пры кашлі, чыханні, або разгаворы, туберкулёзныя хворыя распаўсюджваюць па паветры свае бацылы і гэта служыць матэрыялам для заражэння.

Калі арганізм дзіцяці аслаблен, дастаткова хвораму туберкулёзам кашлянуць у бок дзіцяці ці пацалаваць яго, каб адбылося заражэнне. Вельмі небяспечнай крыніцай распаўсюджання заразы з'яўляецца макрота хворага. Туберкулёзны хворы кашлем і чыханнем рассейвае ў паветры кропелькі сваёй макроты разам з туберкулёзнымі палачкамі. Частка гэтых палачак гіне пад уплывам сонечнага святла і паветра, а частка асядае на розных прадметах, высыхае і доўга можа служыць крыніцай заразы.

Туберкулёзныя палачкі могуць папасці на рукі дзіцяці не толькі з макроты, але і ад розных другіх брудных крыніц. Некаторыя дзеці трымаюць пальцы ў роце, грызуць ногці, калупаюць у носе, ядуць нямытымі рукамі, усё гэта можа служыць крыніцай занясення заразы.

Вялікую ролю ў перадачы заразы адыгрываюць таксама мухі. Сядаючы сваімі лапкамі на розныя нечыстоты, мухі могуць захапіць на лапкі туберкулёзныя палачкі, а потым перанесці іх на харчы. Устаноўлена, што туберкулёз у дзяцей з'яўляецца пасля рада захворванняў: кары, коклюша, грыпа і т. д.

Важна таксама ведаць, што і жывёла хварэе туберкулёзам. Ужываючы не гатаванае малако ад каровы, хворай туберкулёзам, можна гэтым перадаць туберкулёзную заразу дзіцяці.

Трэба памятаць, што хворыя туберкулёзам (сухотамі) маці, бацька, бабуля, няня, сваякі і знаёмыя пры несвядомых паводзінах, пры неахайнасці могуць прынесці велізарную шкоду нашаму маладому пакаленню. Гэта перш за ўсё абавязаны памятаць бацькі, на абавязку якіх ляжаць клопаты аб здароўі сваіх дзяцей.

Як праяўляецца туберкулёз у дзяцей.

У грудным узросце маці часамі заўважае, што дзіцё па незразумелых прычынах дрэнна расце, дрэнна есць, худзее, бляднее, чахне, наглядаецца невялікае павышэнне тэмпературы, пацее, а часта і кашляе. Заражэнне туберкулёзам часцей за ўсё адбываецца ў раннім дзіцячым узросце, таму не трэба чакаць, пакуль хвароба будзе развівацца, а неабходна кожнай работніцы і калгасніцы пры дрэнным развіцці дзіцяці, зараз-жа звярнуцца да ўрача.

У дзяцей старэйшага ўзросту туберкулёз звычайна з'яўляецца такім чынам. Часцей за ўсё нязначна павышаецца тэмпература, падае апетыт, пачынаецца схуданне, бледнасць, кругі пад вачамі, начныя поты, дзіцё адстае ў вазе і росце, выгляд дзіцяці не адпавядае яго ўзросту. Часамі такія дзеці адстаюць у вучобе, нервовыя і капрызныя. Бацькі часта, не ведаючы аб тым, што дзіцё хворае, дарэмна караюць такіх дзяцей.

Туберкулёзны працэс можа паразіць любы орган чалавека. Часцей за усё туберкулёз у дзяцей паражае залозы. У чалавечым арганізме ёсць шматлікія залозы (бранхіяльныя, лімфатычныя, забрушынныя і другія). Яны размешчаны па ўсяму арганізму (на шыі, пад пахамі, у грудной і брушной часці арганізма і ў другіх мясцах).

Побач з другімі функцыямі, залозы служаць таксама для абароны арганізма ад розных хвароб. Гэта бывае тады, калі абаронныя сілы арганізма ўстойлівы. Але калі бацылы працягваюць паступаць, а арганізм аслаблен, то залозы не маюць магчымасці справіцца з заразай. Вельмі часта ў дзіцячым узросце туберкулёзныя палачкі паражаюць бранхіяльныя залозы (бронхаадэніт). Часамі на шыі, пад пахамі, можна заўважыць прыпухлыя залозы, калі яны паражаны туберкулёзам. У выніку захворвання залоз у запушчаных выпадках могуць з'явіцца нагнаенні, свішчы і ўродлівыя рубцы.

Звычайна, дзіцё пры належным доглядзе, добра спраўляецца з туберкулёзам залоз, але ва ўскладнёных выпадках працэс можа і цяжка працякаць. Туберкулёзныя палачкі і іх яды могуць з залоз прарвацца ў крывяносныя сасуды і токам крыві разносіцца па ўсяму арганізму або яны могуць затрымацца ў лёгкіх, касцях, печані, мазгавых абалонках і другіх мясцах і выклікаць там туберкулёзныя працэсы.

Адной з форм праяўлення туберкулёза ў дзяцей з'яўляецца таксама «залатуха». Залатушныя дзеці бываюць худыя, бледныя, а часамі і поўныя, рыхлыя. Часта ў іх бываюць нарывы і сып на целе і галаве. Вочы гнояцца, з'яўляецца светабаязнь. З вушэй цячэ гной. У такіх дзяцей заўсёды насмарк.

Акрамя гэтых форм туберкулёза сустракаюцца і другія формы—туберкулёз лёгкіх, брушных органаў, скуры, касцей і суставаў. Асабліва небяспечным захворваннем з'яўляецца туберкулёз мазгавых абалонак.

Як захаваць дзяцей ад туберкулёза.

Захаваць дзяцей ад туберкулёза можна: па—першае, шляхам агульнага ўмацавання дзіцячага арганізма, узброіць яго на барацьбу з усімі заразнымі захворваннямі, па-другое, захаваць дзяцей ад крыніц заразы і, па—трэцяе, своечасова звярачацца да ўрача і, пры выяўленні ў дзіцяці туберкулёза, акуратна выконваць усе ўрачэбныя парады і лячэнне.

Умацаванне дзіцячага арганізма трэба пачаць з ранняга дзіцячага ўзросту.

Для нармальнага развіцця і росту арганізма дзіцяці самае важнае—гэта правільнае харчаванне. У першыя месяцы жыцця дзіцяці самым каштоўным харчаваннем для забеспячэння здароўя з'яўляецца малако маці. Вопыт паказаў, што малако каровы ці казы ніколі не можа замяніць дзіцяці малако маці.

Вельмі важна даваць дзецям страву рознастайную і заўсёды ў адзін і той-жа час. Недастатковы сон затрымлівае развіццё дзіцяці, знясільвае яго. Трэба прывучыць дзіцё своечасова класціся спаць, даць яму магчымасць спаць столькі, колькі патрабуецца для яго ўзросту.

Надзвычай важна трымаць дзяцей у чыстаце. Таму неабходна сачыць за чыстатой у кватэры, не падымаць пылу пры ўборцы, рабіць вільготную ўборку, часта праветрываць пакоі. Весці барацьбу са шкоднымі паразітамі мухамі, клапамі, блохамі і тараканамі. Чыстата скуры дзіцячага арганізма адыгрывае выключна вялікую ролю для ўмацавання здароўя дзіцяці. Трэба мыць дзяцей часцей, асабліва летам.

Велізарнае значэнне для ўмацавання дзіцячага арганізма мае сонца і свежае паветра. Неабходна прывучыць дзяцей да ўсякага надвор'я (у вялікія маразы, выводзіць дзяцей не рэкамендуецца). Усім клеткам нашага арганізма, як і ўсім раслінам і жывёлам неабходна сонечнае святло. Прамое сонечнае святло забівае туберкулёзныя палачкі, якія ў цёмным і вільготным пакоі могуць жыць вельмі доўга.

Асабліва асцярожна трэба быць з дзіцём, калі ў сям'і ёсць туберкулёзныя (сухотныя) хворыя.

Кожны свядомы хворы і акружаючыя яго павінны памятаць, што трэба ўзмоцнена і акуратна лячыць туберкулёз і аберагаць дзяцей ад заражэння. Пры кашлі ці чыханні туберкулёзны хворы павінен адварачвацца ў бок. Пляваць такому хвораму трэба ў спецыяльна прыстасаваныя плявацельніцы.

Чым раней пачынаюць лячыць туберкулёз у дзіцяці ці дарослага, тым менш даецца магчымасці хваробе распаўсюджвацца і тым хутчэй наступае палепшанне і выздараўленне. Запушчаную хваробу лячыць цяжка, а часамі і позна. Трэба ведаць, што вылечыць туберкулёз толькі рознымі парашкамі і мікстурамі нельга. Лячыць туберкулёз—значыць узняць абаронныя сілы хворага арганізма і зрабіць яго трывалым у барацьбе з хваробай.

У нас, у Совецкім Саюзе, вядзецца шырокая барацьба з дзіцячым туберкулёзам. Для гэтага ў гарадах, раёнах і сёлах арганізавана вялікая колькасць пунктаў урачэбнай дапамогі і бальніц, дыспансераў і санаторыяў.

Туберкулёзнае дзіцё можна лячыць і дома, але такое дзіцё павінна быць заўсёды пад наглядам урача.

Партыя і ўрад абкружаюць дзяцей выключнай увагай. З кожным годам расце сетка аздаравіцельных устаноў для дзяцей: кансультацыі, яслі, дзіцячыя сады і розныя дзіцячыя здравніцы. Няма ящчэ такой краіны, якая-б так клапацілася аб дзецях, як у нашым шчаслівым Совецкім Саюзе.

Д-р Новасёлак.

ЦАНА 20 кап. Да гэтага нумара дадаецца ўкладка-выкрайка.

Вас. Лебедев-Кумач

Песня О ПРИСЯГЕ

014

Я Родины славной защитник и воин,
Я сын трудового отца,
Клянусь и ручаюсь, что буду достоин
Высокого званья бойца.

Недаром народу давал я присягу
И Родине всей присягал,
В бою отступать я не буду ни шагу
И грудью пойду на врага.

Я полон отваги, я крепок и молод,
И в бой я за правду иду,
За землю, за волю, за серп и за молот,
За красную нашу звезду.

Клянусь я народу и милой отчизне
И выполню клятву свою;
Щадить я не буду ни крови, ни жизни,
С врагами сражаясь в бою.

Я буду советскую нашу державу
Достойно и смело хранить,
И Армии Красной геройскую славу
Не дам никому уронить.

Я родины славной защитник и воин,
Я сын трудового отца,
Клянусь и ручаюсь, что буду достоин
Высокого званья бойца

В ТЕМПЕ ПОХОДНОГО МАРША.



Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 172. Тыраж 12.667 экз. Ум. Галоўліта БССР № 92.
Здана ў друкарню 28/I—39 г. Падпісана да друку 11/II—39 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знакаў.